# Інфармацыя

## Бібліятэка новая – рарытэты ў спадчыну

Для навукоўцаў і чытачоў Беларусі хутка наступіць свята – адкрыццё новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі – гэтага сапраўднага сховішча багацця духу беларускага народа. Удвая прыемна, што нават у час наваселля бібліятэка, не забываючы пра старажытную спадчыну нацыі, выдала унікальны фотаальбом «Рарытэты». Каментарыі тут падаюцца па-беларуску і па-англійску. У чытачоў ёсць магчымасць пазнаёміцца з ілюстраваным каталогам айчынных рарытэтаў. З вялікага мноства кніжных помнікаў было адабрана толькі каля 80. А ўсяго ў бібліятэцы захоўваецца каля 70 тыс. старадрукаў, рукапісных кніг і рэдкіх выданняў.

Сапраўднай жамчужынай калекцыі з'яўляецца адзіны ў Беларусі збор выданняў нашага слыннага земляка, першадрукара Францішка Скарыны – выпускі Бібліі, выдадзеныя ў Празе ў 1517–1519 гады. Знайшлі сваё пачэснае месца сярод рарытэтаў бібліятэкі і выданні з полацкай друкарні, якая дзейнічала ў 1787–1820 гадах і была створана пры езуіцкім калегіуме. Гэтая друкарня ў свой час выпусціла звыш 500 выданняў на польскай, лацінскай, рускай, італьянскай, нямецкай і французскай мовах. Выдавала яна і знакаміты «Каляндар полацкі», дзе змяшчаліся цікавыя краязнаўчыя матэрыялы пра Полацк, а таксама – часопіс «Месенчнік палоцкі». Дарэчы, сам фонд Нацыянальнай бібліятэкі ў свой час у шэрагу іншых фарміраваўся і з бібліятэк Полацкай езуіцкай калегіі, Віцебскай духоўнай семінарыі.

Сярод рарытэтаў бібліятэкі ёсць таксама прыжыццёвыя выданні Міхаіла Ламаносава, кнігі, выдадзеныя заснавальнікам кнігадрукавання ў Расіі і Украіне Іванам Фёдаравым, рукапіс XVI стагоддзя «Тайная тайных, або Арыстоцелевы вароты» на старажытнабеларускай мове, «Кніга хронік» Х.Шэдэля (1493), «Боская камедыя» Дантэ (1481).

Цудоўную спадчыну ў выглядзе рарытэтаў – рукапісаў, старадрукаў, рэдкіх і каштоўных выданняў – захоўваюць сховішчы Нацыянальнай бібліятэкі. А якая гэта асалода – знаходзіцца ў добрай, багатай бібліятэцы. Глядзець на кнігі – і то ўжо шчасце для сапраўднага чытача! А рарытэтныя кнігі – гэта галасы нашых далёкіх продкаў, якія робяць нас, у XXI стагоддзі, нашчадкамі духоўнага жыцця мінулых вякоў. І, дарэчы, само доўгажыхарства кніг залежыць ад ступені таленту іх стваральнікаў.

Добрая ж кніга – гэта заўсёды падарунак-запавет Аўтара чалавечаму роду.

*Кастусь Карнялюк*
*(г.Віцебск)*

